Аналогичным образом широкий круг вопросов обсудила и XVII-я конференция: отчетный доклад губкома, отчет губКК, об укреплении партаппарата и усилению партруководства, о политико-воспитательной работе, о работе РЛКСМ, о советском строительстве, о мероприятиях по укреплению сельского хозяйства, о работе кооперации, о терстроительстве и Красной Армии; все принятые резолюции тоже были опубликованы [11]. Итоги же последней, XVIII губпартконференции подвел секретарь губкома А. Корчагин: «Работа XVIII губпартконференции проходила в обстановке дальнейшего экономического роста и развития социалистических элементов в хозяйстве нашей страны, а также и нашей губернии, усиления политической активности широких масс рабочих и крестьян… Все эти моменты красной нитью проходили во всей работе губпартконференции…». Одновременно А. Корчагин подчеркнул, что «она с негодованием осудила выступление лидеров «новой оппозиции», считая это выступление порпыткой оппозиции принести фракционную борьбу в международное коммунистическое движение…» [2, с. 3].

Период НЭПа являлся временем, когда тотальный партийный контроль за всеми сторонами жизни общества еще не установился, во многом сохраняли свою самостоятельность органы Советской власти, кооперативы, общественные организации, но тенденция к усилению влияния РКП(б) была очевидной, что наглядно показывает изучение материалов губернских партийных конференций, особенно с середины 1920-х гг., когда развернулась острая внутрипартийная борьба.

1. Итоги XII губпартконференции // Известия Псковского губкома РКП(б). – 1922. – Июнь. – № 13. – С. 15–18.
2. Корчагин А. Итоги XVIII губпартконференции / А. Корчагин // Спутник большевика. – 1927. – № 1 (64). – С. 3–5.
3. К предстоящей XIII-й губпартконференции // Известия Псковского губкома РКП(б). – 1922. – Октябрь. – № 17. – С. 7–8.
4. К губернской партконференции // Известия Псковского губкома РКП(б). – 1922. – Ноябрь. – № 18. – С. 11–20.
5. Отчет Псковского губкома РКП(б) XV-й губпартконференции (май 1924 г.) // Отделение документов новейшей истории и по личному составу Государственнного архива Псковской области (далее – ОДНИЛС ГАПО). – Ф. 1. Оп. 1. Д. 332. Л. 1–126.
6. Отчет Псковского губкома XVII-й губпартконференции с 1 октября 1924 г. по 1 октября 1925 г. // ОДНИЛС ГАПО. – Ф. 1. Оп. 1. Д. 374. Л. 1–113.
7. Очерки истории Псковской организации КПСС / ред. коллегия: З.П. Антонова (отв. ред.) [и др.]. – Л. : Лениздат, 1971. – 542 с.
8. Струппе, П. К очередной губпартконференции / П. Струппе // Известия Псковского губкома РКП(б). – 1924. – Апрель. – № 4 (33). – С. 40–48.
9. Струппе, П. Что сказала XV-я губпартконференция / П. Струппе // Известия Псковского губкома РКП(б). – 1924. – Июль. – № 7 (35). – С. 1–9.
10. Резолюции XVI-й губпартконференции (28 декабря 1924 – 1 января 1925 гг.) // ОДНИЛС ГАПО. – Ф. 1. Оп. 1. Д. 337. Л. 1–32.
11. Резолюции XVII-й губпартконференции // Известия Псковского губкома РКП(б). – 1925. – № 11 (51). – С. 89–125.
12. XIV-я губконференция РКП(б) (5-6 апреля 1923 г.) // Известия Псковского губкома РКП(б). – 1923. – Апрель-май. – № 4-5 (23-24). – С. 25–27.
13. Филимонов, А. В. М. И. Калинин и Псков / А. В. Филимонов // Псков: научно-практический, историко-краеведческий журнал. – 2017. – № 46. – С. 93–101.

**Бамбешка І.І.**

## МАТЭРЫЯЛЫ БЕЛАРУСКІХ КРАЯЗНАЎЧЫХ З'ЕЗДАЎ І КАНФЕРЭНЦЫЙ МІЖВАЕННАГА ПЕРЫЯДУ ЯК ГІСТАРЫЧНАЯ КРЫНІЦА

Адным з найбольш знакавых перыядаў у гісторыі краязнаўства і айчыннай гісторыі з'яўляецца міжваенны перыяд. Менавіта 1917–1941 гг. уяўляюць несумненную цікавасць у плане вывучэння гісторыі грамадскага жыцця, гісторыі навукі і культуры, гісторыі беларускай і савецкай інтэлігенцыі, гісторыі распаўсюджання ведаў. Гісторыя развіцця краязнаўчага руху можа быць рэканструявана з дапамогай шырокага комплексу крыніц.

Паколькі найважнейшыя пытанні развіцця краязнаўства ў міжваенны перыяд вырашаліся на усебеларускіх краязнаўчых канферэнцыях і з'ездах і праводзіліся ў жыццё з дапамогай Цэнтральнага бюро краязнаўства (ЦБК), то ўнікальнай крыніцай па гісторыі краязнаўчага руху ў міжваенны перыяд з'яўляюцца матэрыялы згаданых краязнаўчых форумаў.

Так, у сакавіку 1924 г. для распаўсюджвання інфармацыі аб функцыях і дзейнасці ЦБК, якое было створана 29 снежня 1923 г., і выпрацоўкі асноўных кірункаў краязнаўчага вывучэння краю, абмеркавання пытанняў арганізацыі краязнаўчай працы, выяўленне краязнаўчых сіл, працуючых у Мінску, і іх аб'яднанне была склікана Мінская краязнаўчая канферэнцыя [6, с. 7]. На канферэнцыю былі запрошаны прадстаўнікі краязнаўчых арганізацый Мінска і розных дзяржаўных структур, зацікаўленых у развіцці краязнаўства. Шырокі абмен думкамі і прынятыя на канферэнцыі рашэнні паклалі пачатак шырокаму разгортванню краязнаўчага руху ў БССР. З праграмным дакладам аб асаблівасцях краязнаўчага руху выступіў тагачаснага старшыня ЦБК А. А. Смоліч, які адзначаў яго масавы, грамадскі характар, гаварыў, што праца краязнаўцаў "мае на ўвазе высокакваліфікаваную дзейнасць, якую вядуць вузкія спецыялісты". На думку дакладчыка, масавасць руху дасць магчымасць самага

шырокага і падрабязнага вывучэння ўсіх адметнасцяў краю. Вельмі важным з'яўляецца і той факт, што ў дакладзе А. А. Смоліча была агучана і прыкладная структура арганізацыі краязнаўчага руху ў Беларусі: ЦБК – павятовыя таварыствы краязнаўства – іх аддзяленні на месцах [7, с. 2]. У аснову дадзенай структуры быў паклазены тагачасны адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел БССР. У далейшым падобная іерархічная будова, праўда, з пэўнымі зменамі, зацвердзілася на практыцы і была замацавана пастановамі I і II Усебеларускіх краязнаўчых з'ездаў.

На каферэнцыі былі абмяркаваны спосабы пашырэння краязнаўчых ідэй і ўцягнення ў краязнаўчую працу шырокіх колаў працоўнай інтэлігенцыі. Канферэнцыя дазволіла ЦБК наладзіць сувязь з правінцыяльнымі краязнаўчымі арганізацыямі, актывізаваць супрацоўніцтва з расійскімі калегамі з мэтай атрымання метадычнай дапамогі [3, с. 85].

На згаданай канферэнцыі з дакладамі на гісторыка-краязнаўчую тэматыку выступілі рэктар БДУ У. І. Пічэта "Пра крыніцы па гісторыі Беларусі", дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея (БДМ) П. В. Харламповіч "Пра становішча цэнтральнага музея" і супрацоўніка Дзяржаўнага архіва І. М. Барашка "Пра становішча цэнтральнага архіва" [7, с. 2]. Гэтыя нешматлікія выступленні, нягледзячы на тое, што яны не насілі метадычнага характару, акрэслілі асобныя тэмы для гісторыка-краязнаўчага даследавання на бліжэйшы час: выяўленне, вывучэнне і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны.

Інфармацыя аб Мінскай краязнаўчай канферэнцыі была апублікавана ў цэнтральнай рэспубліканскай прэсе – у газеце "Савецкая Беларусь", там жа былі змешчаны ў вельмі сціслым аб'ёме і матэрыялы выступленняў дакладчыкаў.

29 лістапада – 1 снежня 1924 г. ужо пасля ўзбуйнення БССР адбылася I Усебеларуская краязнаўчая канферэнцыя, у якой прынялі ўдзел прадстаўнікі розных дзяржаўных устаноў, ЦБК і ўсіх краязнаўчых арганізацый БССР [4, с. 168]. Усебеларуская краязнаўчая канферэнцыя сведчыла, што кіраўніцтва рэспублікі вельмі зацікаўлена ў распаўсюджванні краязнаўства, прычынай такой зацікаўленасці была неабходнасць ва ўсебаковым вывучэнні Беларусі і ўцягненні ў гэты працэс як мага большай колькасці жыхароў краіны, выяўленні найбольш здатных і перспектыўных да навуковай дзейнасці асоб, што набывала найбольшую актуальнасць ва ўмовах катастрафічнага недахопу навуковых кадраў.

На I Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі, як і на Мінскай, абмяркоўваліся пытанні папулярызацыі краязнаўства. Прысутныя канстатавалі распаўсюджванне краязнаўчага руху па БССР: у канцы 1924 г. у Беларусі налічвалася 38 цэнтраў краязнаўчай актыўнасці, з якіх 16 – аматарскіх краязнаўчых арганізацый, 8 – краязнаўчых арганізацый ў розных навучальных устаноў [5, с. 10–11].

Адначасова канферэнцыя намеціла пэрспектывы і метады каардынацыі краязнаўчай працы ў БССР. Асноўнай перашкодай для ўцягнення ў гэту справу шырокіх слаёў насельніцтва і выкарыстання вынікаў іх працы была адсутнасць сувязі паміж краязнаўчымі арганізацыямі і немагчымасць публікацыі вынікаў сваёй працы. Таму для вырашэння дадзенай праблемы было намечана выданне спецыяльнага краязнаўчага часопіса. На канферэнцыі закраналіся і пытанні метадычнага характару. У абавязкі Інбелкульта было ўведзена выданне разнастайных праграм і метадычных прац і падручнікаў для краязнаўцаў [11, с. 170].

Асноўнай крыніцай інфармацыі аб згаданай канферэнцыі стала публікацыя ў часопісе "Асьвета". Гэта было аб'яднанае выданне Народнага камісарыяту асветы і Саюзу працаўнікоў асветы БССР, які пачаў выпускацца ў чэрвені 1924 г. на беларускай і рускай мовах. Паколькі ў тагачаснай Беларусі не было наркаматаў культуры і інфармацыі, а таксама адпаведных прафсаюзных выданняў, то на старонках названага часопіса змяшчалася разнастайная інфармацыя па пытаннях культурна-асветнага будаўніцтва, методыкі і метадалогіі выкладання і прафсаюзнай работы.

Для падвядзення першых вынікаў краязнаўчай дзейнасці, а таксама для замацавання асноўных форм і выпрацоўкі галоўнага накірунку краязнаўчай працы 7–11 лютага 1926 г. у Мінску быў скліканы I Усебеларускі краязнаўчы з'езд. Па характары з'езд істотна адрозніваўся ад папярэдняй лістападаўскай канферэнцыі 1924 г.: калі на апошняй асноўнымі былі пытанні арганізацыі, папулярызацыі і кіраўніцтва краязнаўчым рухам, то на з'ездзе пераважалі пытанні метадычнага характару, у адпаведнасці з якімі неабходна было праводзіць практычнае краязнаўчае вывучэнне Беларусі. У чарговы раз было падкрэслена, што галоўная мэта краязнаўчай дзейнасці – гэта "абслугоўваньне вытворчых патрэб мясцовых гаспадарчых і культурных устаноў", якім прадастаўляліся канкрэтныя матэрыялы. Асноўным відам навуковай дзейнасці краязнаўчай арганізацыі было прызнана навуковае апісанне сваёй мясцовасці, якія ў суме складуць падрабязнае апісанне усёй Беларусі [8, с. 83]. На з'ездзе важнае значэнне мелі даклады інструкцыйнага характару, зробленыя вядомымі беларускімі даследчыкамі (А. У. Фядзюшыным, С. М. Некрашэвічам, М. І. Гарэцкім, С. А. Пятровічам, М. В. Доўнар-Запольскім і М. В. Мялешкам). Гэтыя выступленні вызначылі асноўныя напрамкі навуковай дзейнасці краязнаўцаў: выяўленне, улік, ахову і выкарыстанне гісторыка-культурных каштоўнасцей; ахову, збор і назіранне за з'явамі прыроды; выяўленне і вы-

вучэнне вытворчых сіл і мясцовых промыслаў у народнагаспадарчых мэтах [1, с. 77]. Амаль усе даклады, за выключэннем выступлення А. У. Фядзюшына аб прыродазнаўчым вывучэнні Беларусі, прадугледжвалі даследаванні той ці іншай з'явы ў гістарычнай перспектыве.

Вынікі выканання шырокай праграмы дзейнасці, прынятай на І Усебеларускім краязнаўчым з'ездзе, былі падсумаваны на ІІ Усебеларускім краязнаўчым з'ездзе, які адбыўся 10–13 лютага 1927 г. Акрамя справаздачных дакладаў кіраўніцтва ЦБК, акруговых і асобных таварыстваў краязнаўства на ІІ Усебеларускім краязнаўчым з'ездзе таксама была акрэслена праблематыка навуковых даследаванняў краязнаўцаў, тым ліку сезонныя феналагічныя і метэаралагічныя назіранні, вывучэнне бюджэту часу селяніна, вывучэнне хатніх рамёстваў, збіранне вуснай народнай творчасці і слоўнікавага матэрыялу, апісанне паселішча, апісанне помнікаў старажытнасці і стварэнне археалагічнай карты раёна і г. д. [9, с. 116].

Матэрыялы І і ІІ Усебеларускіх краязнаўчых з'ездаў выйшлі асобнымі зборнікамі [10, 9], а таксама праца з'ездаў шырока асвятлялася ў чарговых нумарах краязнаўчага часопіса "Наш край".

На ІІ Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі, што адбылася 7–12 студзеня 1929 г. у Мінску, побач з канстатацыяй яскравых поспехаў у справе папулярызацыі краязнаўства і арганізацыі даследавання Беларусі ў розных кірунках, краязнаўчыя арганізацыі рознага ўзроўню крытыкаваліся за недастатковую актыўнасць у галіне вывучэння сучаснай эканомікі і энергетычных рэсурсаў краіны. Як і на папярэдніх краязнаўчых з'ездах кіраўнікі краязнаўчага руху, прадстаўнікі краязнаўчых арганізацый рознага ўзроўню выступалі са справаздачнымі дакладамі. Прагучала таксама шмат інструкцыйных дакладаў, якія насілі праграмны характар. Гэта былі выступленні А. М. Ляўданскага, В. Ю. Ластоўскага, М. І. Касяровіча, І. І. Цвікевіча і шэрагу іншых спецыялістаў, якія арыентавалі на правядзенне на месцах шырокіх краязнаўчых даследаванняў [2].

Апошнім краязнаўчым форумам міжваеннага перыяду стала ІІІ Усебеларуская канферэнцыя, якая адбылася 25–26 студзеня 1930 г. На ёй гучала разгромная крытыка дзейнасці лепшых краязнаўчых арганізацый, кіраўніцтва краязнаўчага руху. ЦБК было абвінавачана ў адсутнасці яснай устаноўкі па эканамічных пытаннях, адзначаўся надзвычай нізкі ўзровень работы па вывучэнні калгаснага руху і прамысловасці, гучалі патрабаванні ліквідацыі нацыянальных секцый пры таварыствах [12, с. 57]. Справаздачнае выступленне старшыні ЦБК А. З. Казака і яго калег стала своеасаблівым падсумаваннем дзейнасці краязнаўцаў за апошняе дзесяцігоддзе. На чарговай канферэнцыі было вырашана актыўна ўключыцца ў сацыялістычнае будаўніцтва і выкананне пяцігадовага плана. Сярод асноўных заданняў для краязнаўчых арганізацый было вывучэнне калгаснага руху ў раёнах суцэльнай калектывізацыі, фабрык і заводаў, быту рабочых і рэвалюцыйнага руху [12, с. 66–67]. Такім чынам план краязнаўчага вывучэння мясцовасці быў кардынальна зменены ў адпаведнасці з новымі сацыяльна-эканамічнымі і палітычнымі рэаліямі.

Матэрыялы ІІ і ІІІ Усебеларускіх краязнаўчых канферэнцый самастойнымі выданнямі не выходзілі, а былі змешчаны ў чарговых нумарах часопіса "Наш край", таму падаваліся ў даволі сціслым выглядзе.

Такім чынам, знакавай падзеяй у гісторыі краязнаўчага руху ў міжваенны перыяд сталі агульнарэспубліканскія сходы краязнаўцаў. Усяго адбылося два усебеларускіх краязнаўчых з'езда, тры ўсебеларускіх краязнаўчых канферэнцыі і адна Мінская краязнаўчая канферэнцыя, якая, нягледзячы на пэўную тэрытарыяльную абмежаванасць, мела вельмі важнае значэнне для разгортвання краязнаўчага руху ў рэспубліцы. Матэрыялы Мінскай краязнаўчай канферэнцыі, І, ІІ і ІІІ Усебеларускіх краязнаўчых канферэнцый былі змешчаны ў рэспубліканскім перыядычным друку (газеце «Савецкая Беларусь», часопісах «Асьвета» і «Наш край»). Даклады на І і ІІ Усебеларускіх краязнаўчых з'ездах, а таксама рэзалюцыі былі выдадзены асобнымі зборнікамі. Усе пералічаныя дакументы маюць выключную навуковую каштоўнасць, паколькі дазваляюць сфарміраваць уяўленне аб адносінах улады, навуковай грамадскасці да такой важнай з'явы, як краязнаўчы рух. Згаданыя крыніцы ўтрымліваюць у тым ліку і статыстычныя звесткі аб колькасці краязнаўчых арганізацый рознага ўзроўню, аб актыўнасці іх работы, змяшчаюць матэрыялы метадычнага і інструктыўнага характару.


1. Гужалоўскі, А. Музеі Беларусі (1941–1991 гг.) / А. Гужалоўскі ; навук. ред. У. М. Міхнюк. – Мінск : Нац. арх. Рэсп. Беларусь, 2004. – 192 с.
2. ІІ Ўсебеларуская Краязнаўчая Конфэрэнцыя, 7–12 студзеня 1929 г. // Наш край. – 1929. – №1. – С. 49–72.
3. Інстытут беларускай культуры. Гісторыя ўзнікнення. Сучасная структура. Навукова-даследчая дзейнасць / апрац. А. І. Цвікевіч. – Мінск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1926. – 118 с.
4. І. С. Усебеларуская краязнаўчая конферэнцыя / І. С. // Асьвета. – 1924. – № 3. – С. 168–169.
5. Краеведные учреждения СССР. Список обществ и кружков по изучению местного края, музеев и других краеведных организаций / Центральное бюро краеведения. – Л. : ЦБК, 1925. – 136 с.
6. Краязнаўчыя арганізацыі БССР // Наш край. – 1925. – №1. – С. 6–10.
7. М. Менская краязнаўчая канферэнцыя // Савецкая Беларусь. – 1924. – 1 красавіка. – С. 2.
8. Пастановы першага Ўсебеларускага Краязнаўчага Зьезду 7–12 лютага 1926 г. ў Менску // Наш край. – 1926. – № 2-3 (5-6). – С. 82–86.
9. Працы другога Усебеларускага краязнаўчага зьезда, 10–13 лютага 1927 года. – Менск : Інбелкульт, – 1927. – 122 с.

10. Працы першага Усебеларускага краязнаўчага зьезда, 7–11 лютага 1926 г. / рэд. А. Смоліч. – Менск : Коштам Ін-та беларус. культуры, 1926. – 81 с.
11. Рэзолюцыі Ўсебеларускай краязнаўчай конферэнцыі па арганізацыйнаму пытаньню і дакладах навуковых установаў // Асьвета. – 1924. – № 3. – С. 169–171.
12. Трэцяя Ўсебеларуская краязнаўчая конфэрэнцыя // Наш край. – 1930. – № 2. – С. 50–69.

**Яковлева Г.Н.**

## БРАЧНО-СЕМЕЙНЫЕ ОТНОШЕНИЯ ГЛАЗАМИ СТУДЕНТОВ КОНЦА 1920-Х ГОДОВ: ЛОКАЛЬНЫЙ АСПЕКТ

В 1920-е годы в СССР происходили огромные социальные сдвиги, затронули они и сферу любви, взаимоотношений между полами, брачно-семейных отношений. Дискуссии по эти проблемам охватили все слои общества, в них участвовали многие видные большевики (А. М. Коллонтай, С. Н. Смидович, Д. З. Мануильский, Е. М. Ярославский, А. В. Луначарский). Разброс мнений по данной проблематике был чрезвычайно широк и менялся в течение всего десятилетия. Тогда же появились первые опросы среди молодежи об их сексуальных практиках, отношении к браку и семье. Статистика различных опросов тех лет (Гельмана, Ласса, Гуревича и др.) свидетельствовала о широком распространении внебрачных сексуальных связей среди студенческой и рабочей молодежи. Однако к концу 1920-х гг. стало очевидно, что эпохе экспериментов в брачно-сексуальной сфере приходил конец. Верхами был взят курс на укрепление семьи, на воспитание ответственности молодежи за родившихся детей, на борьбу против предыдущих теорий о свободной любви, «стакане воды» и т.д. Слишком много скандалов, страданий и разочарований повлекли за собой практики свободной любви, обмена партнерами и явного сексуального потребительства, слишком не соответствовали эти постреволюционные новшества наступавшей эпохе «Большого скачка».

Изменения в нравственно-эмоциональной сфере в молодежной среде и отзвуки предыдущей вольницы в половом вопросе хорошо прослеживаются и на региональном уровне. Рассмотрим, как витебские студенты относились к этим сложным вопросам через призму их ответов на анкеты тех лет.

В начале 1929 г. проводилось обследование студенчества учебных заведений БССР. В его рамках студентам вузов, техникумов и рабфаков была предложена анонимная культурно-бытовая анкета Центрального Бюро Пролетстуда ЦСПСБ. В Витебске на анкету отвечали студенты семи учебных заведений города: ветеринарного института, художественного техникума, белорусского педагогического техникума, еврейского педагогического техникума, кооперативного техникума, политехнического техникума и витебского рабфака. Анкета включала в себя целый ряд вопросов общественно-политического характера, интересовалась состоянием здоровья, условиями учебы, питания и проживания студентов, а также выясняла состояние брачных и сексуальных отношений в студенческой среде. Обобщенные данные Комиссия по проведению обследования из Минска прислала в Витебский окружной комитет КП(б)Б. Они состояли из двух частей: 1) «Сведений о заполнивших анкеты студентах» по каждому учебному заведению и 2) выдержек из студенческих ответов на ряд вопросов, выбранных Комиссией как значимых для партструктур. В первом блоке суммировались ответы студентов на целый ряд вопросов культурно-бытового плана. Эти вопросы предусматривали возможные варианта ответа. Приведем значимые для анализируемой темы вопросы и варианты ответов: играли ли студенты в карты (да-нет-нет ответа), употребляли ли спиртное (да-нет-нет ответа), их отношение к курению (да-нет-нет ответа), ругани (да-нет-нет ответа), пользовались ли косметикой (да-нет-нет ответа). Делались попытки выявить реалии сексуальной жизни молодежи: практиковали ли студенты онанизм (ранее-теперь-нет-нет ответа), имели ли венерические заболевания (да-нет-нет ответа), какова регулярность половой жизни студентов и студенток (нормальная-беспорядочная-воздержание-нет ответа). Выяснялось их представление об идеале половой жизни с предложением таких вариантов ответов: долгосрочные отношения-случайные-воздержание-нет ответа. Подсчитывались отдельно мужские и женские ответы. Во втором блоке приводились достаточно пространные выдержки из развернутых ответов на вопросы общественно-политического характера, и, что важно для нашего анализа, аргументация студентов по поводу их отношения к заключению брака в студенческие годы. Кое-где приводятся даже дополнения к ответам.

Нами подсчитано, что из 1399 студентов упомянутых учебных заведений на анкету ответили 660 студентов, что составляло 47% от их числа. Среди них было 457 мужчин и 203 женщины, что соответствовало тогдашним гендерным реалиям в образовании. Сложно определима степень искренности ответов студентов. Относились ли они к заполнению анкеты ответственно или формально, проявляли в своих ответах на вопросы конформизм или честность? Ни пытались ли они угадать желательные для центра ответы, скрывали ли нелицеприятные сведения о себе? Формулировки анкеты отражают как уровень ее авторов, так и типичные представления тех лет на проблемы секса